# ЖУРНАЛІСЦКАЕ ПЫТАННЕ ЯК СРОДАК РЫТАРЫЗАЦЫІ МЕДЫЯТЭКСТУ (на матэрыяле партала выдавецкага дома «Звязда»)

*В. А. Зразікава*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*zrazikova@tut.by*

На прыкладзе публікацый партала выдавецкага дома «Звязда» разглядаецца адзін з пашыраных у журналісцкай маўленчай практыцы прыёмаў – рытарызацыя медыятэксту. Асобная ўвага ўдзяляецца класіфікацыі журналісцкіх пытанняў з улікам іх рэпрэзентацыі ў медыйнай камунікацыі.

***Ключавыя словы:*** аўтар; выдавецкі дом «Звязда»; журналісцкае пытанне; медыятэкст; рытарызацыя; рытарычная камунікацыя; рэцыпіент.

# JOURNALISTIC QUESTION AS A MEANS OF RHETORIZING MEDIATEXT (at the basis of the materials of the publishing house «Zvyazda» portal)

*V. A. Zrazikova*

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. A. Zrazikova (Zrazikova@tut.by)*

The paper examines a popular journalistic technique – madia text rhetorization at the basis of the materials of the publications of he publishing house «Zvyazda» web-portal. Classification of journalistic questions, considering their representations in media communication, is viewed with particular attention.

***Key words***: author; publishing house «Zvyazda»; journalistic question; media text; rhetorization; rhetorical communication; recipient.

У сучасных медыятэкстах выкарыстанне рытарычных сродкаў і прыёмаў з’яўляецца рэлевантнай формай арганізацыі публіцыстычнага выказвання. Рытарызацыя медыяпрасторы звязана найперш з пошукам новых эфектыўных формаў камунікацыі аўтара і адрасата ва ўмовах зменлівай сацыякультурнай рэальнасці.

На першы план выходзіць камунікатыўна-прагматычная канцэпцыя, а рытарычныя канструкцыі ўспрымаюцца як структураўтваральныя кампаненты наратыву. Аналіз тэкстаў масмедыя ў рытарычным аспекце дазваляе пашырыць уяўленне пра характар медыятызацыйных працэсаў публіцыстычнага дыскурсу і ўдакладаніць яго спецыфіку ў цэлым.

У аснове рытарычнай мадыфікацыі медыядыскурсу знаходзіцца ўстаноўка ўздзеяння на аўдыторыю (стратэгія пераканання), актуалізацыя крэатыўных практык маўлення з дамінаваннем аўтарскага ўсведамлення рэчаіснасці. Адсюль «рытарычная мадальнасць медыятэксту – гэта канчатковы сэнс, дзеля якога гэты тэкст ствараецца. А рытарычны сэнс – гэта камунікатыўна-мэтавая (ці камунікатыўна-інтэнцыянальная) кампанента медыямаўлення. І гэтай кампанентай часцей за ўсё з’яўляецца пераканание» [1].

Як паказвае лінгвістычны аналіз партала выдавецкага дома «Звязда» [2], рытарызацыя медыятэксту адбываецца за кошт ужывання аўтарамі вербальных сродкаў маўленчай выразнасці: тропаў (метафара, метанімія, параўнанне, алегорыя, іронія, аксюмаран, эпітэт, каламбур, перыфраз, эўфемізм), фразеалагізмаў, сінтаксічных (антытэза, паўтор, перыяд, градацыя) і праксемічных рытарычных фігур. Апошнія садзейнічаюць устанаўленню кантакту аўтара з аўдыторыяй: рытарычны ўсклік, рытарычнае пытанне, рытарычны зварот.

Адзін з найбольш дзейсных рытарычных механізмаў – трапеізацыя мовы: *Рыцар беларускай культуры*. Сышоў з жыцця Адам Мальдзіс (04.01.2022); скарбы *гаспадыні меднай гары*; *мінералы з «прапіскай»* ад Прыбалтыкі да Камчаткі; можаце запытацца, …як выглядала «*золата дуракоў*» (ці яшчэ яго звалі кашэчым золатам) (09.01.2022); Выразна бачны падушачкі, бо лапы ў «*тэпцікі*» *з футра* абутыя, *сляды-аўтографы* (08.01.2022); *«паласатая» мара, «вусаты нянь», «дзіця асфальту»* (02.01.2022); Неяк каля пад’езда сустрэў суседа, які жыве паверхам вышэй. Ён вельмі радасна паведаміў, што купляе... тыгра! … Калі сусед убачыў рэакцыю на маім твары, удакладніў, што афармляе дакументы на пакупку аўто «Opel Tigra» (27.12.2021); *цень таленту* (02.10.2021).

З часоў антычнай рыторыкі метад пытання вызначаецца як найбольш эфектыўны сродак выражэння аратарам (аўтарам) сваіх ідэй і перакананняў. Журналісты выкарыстоўваюць яго пры пабудове камунікатыўнага дыялогу. У гэтым сэнсе журналісцкае пытанне мае шырокае значэнне і з’яўляецца асноўным інструментам правядзення інтэрв’ю, размовы.

Журналісцкае пытанне як разнавіднасць рытарычнага належыць да арсенала праксемічных фігур, часта сустракаецца ў структуры медыятэксту і выступае неабходным, натарульным кампанентам журналісцкага маўлення. Як правіла, гэта сцвярджэнне ў форме пытання, якое ўздзейнічае на пачуцці і думкі рэцыпіента і не патрабуе прамога адказу. У залежнасці ад скіраванасці рытарычнай камунікацыі можна вылучыць наступныя тыпы журналісцкіх пытанняў:

1) Пачатковыя пытанні вызначаюць тэму абмеркавання і адначасова выконваюць намінатыўныя функцыі (пытанні-загалоўкі). Па сваёй прыродзе яны падобныя да апелятыўных ці верыфікатыўных пытанняў: *Як чытаць зімовы лес быццам адкрытую кнігу? Аўтографы на снезе* (08.01.2022); *Ці будзе археалагічны музей у Віцебску?* (08.12.2021); *Ці з'явіцца ў Любані вуліца імя газеты «Звязда»?* (21.12.2016); *Вольга, Альгерд, Аляксандр: што іх яднае?* (16.07.2013). У апошнім прыкладзе прыём рытарызацыі праз пытанне з'яўляецца скразным у рубрыкацыі тэксту: *Ці была тут Вольга?, Альгерд на пастаменце?, Неўскі прыязджаў па ўнука?*

2) Удакладняльныя пытанні (пытанні-ідэнтыфікатары) накіроўваюць размову і маюць прадказальныя адказы: *Бо хто быў большым аўтарытэтам у падобным, чым Адам Мальдзіс, які дапамагаў з гістарычным каларытам таму ж Уладзіміру Караткевічу? У каго яшчэ можна было спытаць, ці існуе працяг эпапеі «Каласы пад сярпом тваім», і пачуць у адказ спараўдную дэтэктыўную гісторыю?* (04.01.2022); *Падскочыўшы, драпежніца далезла да гнязда, растрапала, схапіла адну палёўку і пабегла напрасткі да лесу. Можа, спалохалася*? (08.01.2022).

3) Інфармацыйныя пытанні – аб'ектывацыя невядомых аўтару фактаў ці звестак: *Цікава, ці пакінуў Уладзімір Паўлавіч успаміны пра гэтыя краіны?* (16.10.2021).

4) Экспліцытныя пытанні паведамляюць пра яўныя кантэкставыя сітуацыі (аўтар сам на іх адказвае): *Ці ведаюць звяры, што кожны іх крок «запісваецца», і па метках гэтых можна іх адшукаць? Ведаюць.*

*А гэта меткі чые? Дзікія козачкі – меншаная копія аленевых, але яны яшчэ тыя майстры заблытваць сляды!* (08.01.2022).

5) Заключныя пытанні адкрытага тыпу (імпліцытныя, схаваныя) патрабуюць самастойнага пошуку адказаў на аўтарскія запыты і прапановы: Чаму б, напрыклад, з удзелам кітайскага боку (а ў Пекіне і іншых гарадах Паднябеснай плённа працуюць цэнтры, інстытуты славістыкі) не правесці адмысловы практычны семінар перакладчыкаў?

Чаму б не наладзіць у беларускім і кітайскім літаратурна-мастацкім перыядычным друку дыскусію, абмеркаванне на тэму «Каго з кітайскай паэзіі даўніх часін і кітайскай паэзіі сучаснасці найперш перакладаць?..»? Чаму б не правесці ў беларускіх ВНУ, на філалагічных факультэтах універсітэтаў сустрэчы з сучаснымі кітайскімі паэтамі..?

Вось і няма ўжо Міколы Мятліцкага... Няма, лічы, галоўнага рупліўца на ніве развіцця беларуска-кітайскіх літаратурных стасункаў у XXI стагоддзі. Хто прыйдзе следам?.. Хто падхопіць распачатую ім справу стварэння ў Беларусі паэтычнага партрэта Паднябеснай, паэтычнага партрэта блізкага нам Кітая..? (31.12.2021).

Мо ў Беларусі праз кніжнае выданне будзе згадана імя таленавітага нашага земляка?... (16.10.2021).

Рыторыка журналісцкага пытання не патрабуе «перацягвання» суразмоўцы на свой бок, а дапамагае найбольш яскрава і ясна адлюстраваць аўтарскую пазіцыю, пераканаць рэцыпіента ў яе правамернасці. Журналіст такім чынам будуе медыякамунікацыю, каб закрануць самыя важныя, на яго погляд, праблемы (тэмы), але робіць гэта імпліцытным (схаваным) спосабам.

Тыпы журналісцкіх пытанняў выражаюцца ў разнапланавых рэпліках, кожная з якіх выконвае свае функцыі (сугестыўную, намінатыўную, інфармацыйную) і дазваляе зразумець сутнасць аўтарскай пазіцыі ў цэлым. Актуалізацыя рытарычных ведаў і ўяўленняў, асэнсаванне рыторыкі як камунікатыўнай асновы сучаснага працэсу медыятворчасці значна дапамагае ў спасціжэнні матрыцы публіцыстычнага дыскурсу.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Анненкова И. В*. Об одной константе текстов СМИ: к постановке вопроса о риторической модальности // Вестник Пермского университета. 2009. № 5. С. 40–41.
2. Партал выдавецкага дома «Звязда» [Электронны рэсурс]. URL: https://zviazda.by/ru (дата звароту: 09.01.2022).